ную самасвядомасць удзельнікаў будучых самадзейных гуртоў, яны павінны быць нацыянальна свядомымі.

Планаванне і арганізацыя навучальна-выхаваўчага працэсу ва універсітэце культуры дапамагаюць фарміраванню гэтага віду самасвядомасці ў студэнцкай моладзі. Праца ў такім накірунку прадугледжвае падбор зместу вучэбных праграм, шырокі выбар формаў, метадаў, сродкаў выхавання. Яна патрабуе вялікай работы па фарміраванні нацыянальнай самасвядомасці асобы.

**Кундзянок А.І.,**
*аспірантка кафедры харавога мастацтва*

## ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД ДА АСОБЫ Ў ПРАЦЭСЕ РАБОТЫ НАД ХАРАВЫМІ ТВОРАМІ

Адной з важнейшых задач усёй сістэмы музычнай адукацыі з'яўляецца фарміраванне духоўнага свету юнага музыканта, яго эстэтычных пачуццяў.

У Рэспубліцы Беларусь гэтаму пытанню ўдзяляецца вялікая ўвага: распрацоўваюцца праграмы па навучанні ігры на розных музычных інструментах, па харавых і вакальных спевах, пачынаючы з дашкольнага ўзросту. Адчыняюцца ўстановы новага тыпу, вядзецца бесперапынны пошук сродкаў і метадаў для інтэнсіўнага і прадуктыўнага навучання музыцы, для падрыхтоўкі сярэднімі і вышэйшымі ўстановамі высокапрафесійных спецыялістаў. Бо менавіта апошнія будуць весці вучэбна-выхаваўчую работу: фарміраваць погляды, перакананні, густы, ідэалы дзяцей. Выхоўваючы вучняў сродкамі музычнага мастацтва, такі спецыяліст абавязаны быць шырока адукаваным чалавекам, добрым музыкантам, асобай у высокім грамадскім значэнні слова.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Творчасць заўсёды патрабуе наватарства ў дзейнасці. Гэтага ж патрабуе музычная адукацыя. Наватарства ў педагагічнай дзейнасці стварае якасна новую музычную адукацыю і, акрамя таго, новую філасофію музычнай адукацыі. Гэтая філасофія абумоўлена сучаснай рэчаіснасцю, накіравана на свабодную творчасць.

Музычная адукацыя выступае адной з галоўных частак духоўнай культуры. Уся ж духоўная культура з прычыны сваёй цэльнасці, арганічнасці ўвасабляецца ў тэорыі і практыцы музычнага навучання, выхавання, а ўвядзенне новага ў працэс развіцця творчай асобы стварае магчымасць для больш поўнага духоўнага самавыяўлення.

Патрабаванне высокага ўзроўню прафесіяналізму асобы ў грамадстве пачынаецца з патрабавання вялікай прафесійнасці настаўнікаў, выхавацеляў. Бесперапынны рост іх педагагічнага майстэрства выступае асноўнай умовай эфектыўнасці ўсёй адукацыйнай сістэмы, на ўсіх узроўнях яе і ва ўсіх яе звёнах.

Педагагічная дзейнасць павінна быць накіравана на ўзнаўленне і самаўзнаўленне якасцей асобы, важнейшых суб'ектных характарыстык: мэтанакіраванасці, волі, інтэлектуальных здольнасцей.

Галоўная задача педагагічнай дзейнасці — фарміраванне сацыяльнага суб'екта, здольнага да розных відаў дзейнасці, які асэнсавана ставіцца да працэсу сваёй дзейнасці, яго матываў.

Неабходна адзначыць: культурна-гуманітарнае выхаванне арыентуецца на суб'ектныя параметры дзейнасці пры ўліку індывідуальнасці навучэнца, служыць фарміраванню асобы, самаўсведамленню, узбагачэнню духоўнага свету, стварэнню сацыяльна-каштоўнасных якасцей.

У развіцці творчай асобы вялікую ролю маюць духоўныя патрабаванні, іх іерархічныя падсістэмы — мастацкія, музычныя. Таму неабходна ў працэсе навучання дзіцяці выклікаць у яго патрэбнасць ствараць прыгажосць. Гэтая патрэбнасць раскрыецца ў гаме разнастайных

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

эстэтычных інтарэсаў, якія перарастуць ва ўсвядомленую скіраванасць асобы.

Музычная творчасць — працэс складаны, мнагапланавы. Праходзіць ён праз музычныя творы, якія існуюць толькі ў рэальным гучанні, г.зн. у выкананні. Стварэнне музычнага вобраза як канчатковай мэты музычнай патрэбнасці — гэта зносіны на мове музыкі. Працэс задавальнення музычных патрэбнасцей можна вызначыць як працэс духоўных зносін. Галоўная задача музыканта-настаўніка тут заключаецца менавіта ў выяўленні індывідуальных перадумоў у дзіцяці дзеля абуджэння ў яго захаплення музыкай.

Праз прыгажосць дзіця далучаецца да светлага, чыстага, вучыцца адрозніваць дабро ад зла. Усё гэта — крыніца, якая насычае эстэтычныя перажыванні дзіцяці, абуджае свет яго фантазіі.

Музыка з'яўляецца выдатным сродкам эстэтычнага выхавання. Дзеля таго каб яна выконвала гэтую функцыю, трэба перш за ўсё развіваць агульную музыкальнасць, уменне адгукацца на музыку. Музыка хвалюе маленькага слухача, выклікае адпаведныя рэакцыі, пэўныя асацыяцыі. Дзіця вучыцца суперажываць таму, што выяўлена ў музыцы. У яго ўяўленні ўзнікаюць розныя вобразы, пад уплывам іх ён імкнецца праявіць сябе ў спевах, танцы, музычнай гульні.

Часта цяжка знайсці патрэбны ключык да прыгожай музычнай шкатулкі, што ёсць у сэрцы кожнага дзіцяці, рпы гэтым не толькі "музычна адоранага". Але ж знайсці гэты ключык неабходна. Выхаванне пачуццяў — адна з важнейшых задач гарманічнага развіцця асобы. З улікам гэтай задачы галоўным на першым этапе можа быць музыка не сама па сабе, а як займальны выхаваўчы сродак, свет музычных гукаў; дзіця вучыцца слухаць і адчуваць навакольны свет, выяўляць музычнымі гукамі ўражанні. Таму музыка з'яўляецца важным камунікатыўным сродкам у фармі-раванні светапогляду.

Далучэнне да прыгожага маленькага чалавека эфектыўна праходзіць праз гульню. У гульні лягчэй успрымаюцца сур'ёзныя рэчы. І навучанне павінна праходзіць ярка, цікава, таму што яркае, прывабнае дзецьмі ўспрымаецца як прыгожае. Эфектыўнай з'яўляецца індывідуальная праца над музычнымі творамі. Яна дапамагае падрыхтаваць удумлівага слухача, што любіць музыку, здольны разумець глыбіню ідэй, пачуццяў, перажыванняў, закладзеных у лепшых творах класічнай, сучаснай, народнай музыкі.

Перад педагогам-музыкантам стаіць задача навучыць выхаванцаў самастойна арыентавацца ў разнастайных уражаннях, з першых урокаў фарміраваць цікавасць да іх. Чым часцей дзеці слухаюць творы кампазітараў, тым большую цікавасць пачынаюць праяўляць да творчасці іх, вылучаць іх творы сярод іншых.

З першых жа заняткаў музыкай выхоўваецца любоў да беларускай песні. Народныя песні прыцягваюць дзяцей сваімі прыгажосцю, сардэчнасцю мелодый, глыбінёй, шчырасцю, разнастайнасцю жанраў.

Знаёмства дзяцей з народнай творчасцю — важная ўмова разумення музычнай мовы, каштоўнасцей класічнага і сучаснага мастацтва, пранікнення ў яго змест.

Шматлікія характэрныя рысы рускай народнай песні з'явіліся крыніцай творчасці для вялікіх рускіх кампазітараў. М.Глінка, А.Барадзін, М.Рымскі-Корсакаў, М.Мусаргскі, П.Чайкоўскі вучыліся на лепшых узорах народнай музыкі, часта ўключалі народную песню ў творы, па-свойму ўвасабляючы яе, надаючы ёй новае гучанне.

Інтанацыйныя, ладавыя, гарманічныя, метрарытмічныя асаблівасці, уласцівыя рускай народнай песні, можна знайсці і ў сучаснай музыцы. Асваенне музыкі розных эпох, стыляў ствараецца на падставе слыхавага вопыту. У паслядоўнасці гэтага асваення ўлічваецца цесная інтанацыйная сувязь народнай творчасці, класікі і сучаснасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Так, знаёмства малодшых школьнікаў, у якіх слыхавы вопыт яшчэ фарміруецца, з асобнымі фрагментамі музыкі С.Пракоф'ева, Г.Свірыдава, Р.Шчадрына, іншых сучасных кампазітараў стварае неабходныя перадумовы для ўспрыняцця дзецьмі ў далейшым найбольш складаных твораў гэтых аўтараў. Напрыклад, у стылі С.Пракоф'ева сканцэнтраваны характэрныя асаблівасці мовы эпохі. Вядомая М.Гарадзенская рыхтавала навучэнцаў да разумення сучаснай музыкі праз класіку, звяртала ўвагу дзяцей на блізкасць мовы М.Мусаргскага сучаснай музыцы.

Важна спяваць сучасныя мелодыі, якія характарызуюцца навізной мовы. Спяванне на занятках нескладаных сучасных мелодый стварае інтанацыйны запас, патрэбны для ўспрымання, разумення блізкай па стылі музыкі.

Сучасны настаўнік музыкі і спеваў павінен валодаць разнастайнымі сродкамі, каб вучыць дзяцей успрымаць музычны твор, абуджаць цікавасць у іх да музыкі ў працэсе яе вывучэння.

Уступнае слова пры індывідуальнай рабоце над новым музычным творам мае на мэце стварыць адпаведны эмацыянальны настрой, яно выкліча цікавасць, падрыхтуе вучня да ўспрыняцця музыкі.

Адначасова трэба ўлічваць эмацыянальныя адносіны дзіцяці да развучваемага твора. Самая простая п'еса, песня, якую настаўнік прапануе дзецям, павінна ім падабацца. Падбор твора робіцца індывідуальна для кожнага вучня з улікам яго псіхалагічных, фізічных асаблівасцей.

Цікавасць да твора, выкліканая ўступным словам, павінна дапаўняцца яркім, выразным выкананнем. Выкананне магчыма як на фартэпіяна, так і на іншым інструменце. А магчыма і праслухоўванне твора ў грамзапісе. Але найбольш эфектыўны шлях — выкананне непасрэдна педагогам музычнага твора на інструменце, сумяшчэнне, калі гэта песня або харавы твор, са спевамі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Развіццё музычна-слыхавых уяўленняў, неабходных для ўспрыняцця музыкі, адбываецца не толькі ў працэсе слухання, але і ў час вакальнай імправізацыі навучэнцаў. У імправізацыі адбываецца самастойнае асваенне гукаў. Дзеці, захопленыя перадачай пачуццяў, шукаюць тады найбольш выразныя інтанацыі, рытмічныя спалучэнні, тэмбравыя, дынамічныя суадносіны. У імправізацыі навучэнцы развіваюць зададзены меладычны пачатак, падбіраюць рытмічнае суправаджэнне.

Найлепшыя педагогі, развіваючы ў дзяцей музычныя навыкі, павінны імкнуцца выхоўваць галоўнае — уменне не толькі чуць музыку, але і эмацыянальна ўспрымаць яе змест.

Вялікую ролю ў выхаванні эмацыянальнай спагадлівасці адыгрывае аналіз твора. У працэсе разбору можна прыцягнуць увагу юнага музыканта да зместу мастацкага вобраза, музычных сродкаў яго ўвасаблення. Паняцце пра музычны твор, пра яго змест і тое, як ён перадаецца, фарміруецца ў навучэнцаў з самых першых заняткаў і найбольш актыўна ў працэсе асваення выразных элементаў музычнай мовы, раскрыцця музычнага вобраза.

Галоўнай творчай дзейнасцю, якая ў дзяцей эфектыўна пашыраецца, з'яўляецца спяванне. Менавіта песня служыць асноўным матэрыялам для працы на занятках. Стварэнне вучнем выканаўчага плана песні пачынаецца з выяўлення яе характару, настрою; потым шляхам аналізу падбіраюцца неабходныя выразныя сродкі.

У адрозненне ад імправізацыі ў працэсе інтэрпрэтацыі музыкі развіваецца лагічна аргументаванае ўяўленне навучэнца, якое аказвае ўплыў на ўспрыняцце музыкі. Неабходна знаёміць вучня з рознымі тэмбрамі, як вакальнымі, так і інструментальнымі (казка С.Пракоф'ева "Пеця і воўк", уверцюра да оперы М.Рымскага-Корсакава "Снягурачка"). Пастаяннае, паслядоўнае тлумачэнне тэмбравых уяўленняў садзейнічае больш глыбокаму і поўнаму раскрыццю і разуменню мастацкага вобраза.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Больш складаным элементам для ўспрыняцця з'яўляецца гармонія, якая патрабуе спецыяльнай падрыхтоўкі. Каб музычныя ўяўленні надоўга захаваліся ў памяці навучэнцаў, неабходнае неаднаразовае паўтарэнне твора. Пры гэтым раскрываюцца новыя бакі музычнага вобраза, музыка становіцца больш зразумелай, блізкай, цікавай дзецям, уяўленні іх — больш яркімі.

Пры паўторным праслухоўванні цікавасць да музычнага твора абуджаецца з дапамогай параўнання, супастаўленняў. Супастаўляюцца розныя жанры, асобныя часткі твора, рознае выкананне, тэмбры інструментаў і інш.

Здольнасць юнага музыканта знаходзіць падобнае і рознае фарміруецца паступова, залежыць ад назапашвання музычна-слыхавых уяўленняў, якія ляжаць у аснове ўспрыняцця.

Вельмі індывідуальна адбываецца фарміраванне пачуцця стылю ў кожнага вучня. Развіццё музычнага ўспрыняцця працягваецца ў розных формах у пазакласнай рабоце. Гэта музычныя вечары, наведванне тэатраў, канцэртаў. Вельмі важна, каб дзіця чула добрае выкананне твора, каб выкананне аказала на яго моцнае ўражанне, яму яшчэ не раз захацелася б прыйсці ў канцэртную залу паслухаць музыку ці, калі гэта магчыма, схадзіць у оперны тэатр.

Перад педагогам у працэсе індывідуальнай работы з вучнем паўстаюць некалькі ключавых задач. Першая з іх — узаемаадносіны паміж ім і дзіцем. Гэтая праблема вырашаецца дзякуючы таму, што педагог-музыкант знаходзіць шляхі развіцця вучня, найлепшыя формы асабістых зносін. Ступень поспеху тут можа быць рознай: усё залежыць ад кваліфікацыі, асабістых якасцей настаўніка, які павінен улічваць індывідуальныя асаблівасці вучня.

У творчым працэсе педагог павінен быць роўны з усімі — без прыхільнасцей, асабістых сімпатый, антыпатый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аднак яго рэакцыя можа быць і непасрэдным водгукам на тое, што ён пачуў.

Другая задача пры індывідуальным падыходзе да вучня пры развучванні музычнага твора заключаецца ў самой музыцы, у комплексе патрабаванняў, якія выконваюцца у працэсе выканання. Гэтая задача рашаецца ў выпадку, калі музыка прадвызначае напрамак творчых пошукаў: адны творы патрабуюць удзяліць асаблівую ўвагу рытмаінтанацыйнаму боку выканання, другія прымушаюць шмат займацца пошукамі тэмбрадынамічных нюансаў, іншымі музычна-выканальніцкімі праблемамі.

Пры разглядзе твора альбо асобных яго фрагментаў настаўнік музыкі павінен выяўляць памяркоўнасць, шырыню погляду, аднак, што вельмі важна, прызнаваць права на існаванне розных выканаўчых задум, розных формаў іх увасаблення.

Інтэнсіўнасць працэсу занняткаў таксама з'яўляецца неад'емнай часткай творчага працэсу. Яна залежыць як ад педагагічнага тэмпераменту, так і ад індывідуальных асаблівасцей юнага музыканта. Знаходжанне аптымальных формаў і спосабаў работы, правільнасць размеркавання рабочага часу — абавязковая зарука поспеху на занятках.

Выхаванне музычнага мыслення, неабходнасць ужо з першых крокаў уласнымі сіламі вырашаць хаця б некаторыя задачы дапамагаюць дзецям набыць вопыт і навыкі самастойных заняткаў, а гэта моцны фундамент, аснова ўсёй будучай іх творчай дзейнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ